# Скарочаная форма (з дадатковымі патрабаваннямі ўладальніка)

У большасці выпадкаў можна абмежавацца простай формай вашай палітыкі, якая змяшчаецца ў ніжняй часцы сайта.
**Для гэтага робім ужо знаёмыя крокі:**

1. Вызначаем тып ліцэнзіі СС. [Крок 1].
2. Прапісваем дадатковыя ўмовы (адным сказам).
3. Размяшчаем атрыманы тэкст у футэры сайта.

**Напрыклад:**
*"Кантэнт гэтага блога распаўсюджваецца за аўтарствам <Ваша імя> згодна ліцэнзіям Creative Commons <тып ліцэнзіі> 4.0 International. <Асобныя выпадкі будуць адмыслова агаворвацца>."*

**<Ваша імя>** - тут можа быць ваша рэальнае імя, або псеўданім.
**<Тып ліцэнзіі>** - абярыце адну з шасці ліцэнзій Creative Commons. [Крок 1]
**<Асобныя выпадкі будуць адмыслова агаворвацца>** - тут можаце напісаць 1-2 сказы, у якіх вы прапішыце правілы адносна фотаздымкаў, тэкстаў, відэа.

# Разгорнутая форма

1. Падрыхтуйце адмысловую старонку на сайце і назавіце яе, напрыклад, "Умовы выкарыстання", "Правілы сайта".

2. Дадайце спасылку ў ніжняй частцы сайта на гэту старонку.

3. Скапіруце прыклад ніжэй на старонку, і замяніце ўсе блокі ў дужках <> на свой.

4. Таксама звярніце ўвагу, што заканадаўства некаторых краін патрабуе размяшчаць паведамленне пра правілы сайта пры першай загрузцы ў адмысловым вакне знізу або зверху экрана. У Беларусі няма такога патрабавання, але папярджэваць карыстальніка вашага рэсурса лічыцца добрай практыкай - лепей гэтым не грэбаваць.

**Варта ведаць!**

Усе дадатковыя ўмовы, якія вы хочаце адлюстраваць, прапісвайце ў палітыцы сайта.

Калі вашыя ўмовы складаюць болей за 1-2 сказы - лепей стварыць для іх асобную старонку.

Калі вы складаеце базы дадзеных са звестак (фактаў) - выкарыстоўвайце **ліцэнзію СС0** (*creativecommons.org/publicdomain/zero/1.0/legalcode*).

## Прыклад палітыкі

**(Замест словаў <Аўтар>, <Сайт> пастаўце тое што вам патрэбна.)**

Дадзены збор правілаў распаўсюджваецца на матэрыялы, змешчаныя на <Сайце>, калі асобна не пазначана іншае.

Пад кантэнтам разумеецца тэкставы матэрыял, фота, відэа, якія створаны <Аўтарам> <Сайта>.

**Што можна рабіць з кантэнтам?**

Вы можаце капіраваць, распаўсюджваць, рэміксаваць, адаптаваць кантэнт і ствараць вытворныя творы (тэкст, фота, відэа), у тым ліку для камерцыйных патрэб да таго часу, пакуль Вы прытрымліваецеся гэтых жа ўмоваў у дачыненні да сваіх новых твораў, пабудаваных на аснове гэтага. Усе новыя творы будуць адпавядаць тым жа ўмовам. Тэкст ліцэнзіі чытайце на старонцы **Creative Commons Attribution Share-Alike 4.0 International**.

**Што нельга рабіць з кантэнтам?**

<Аўтар> кантэнта забараняе выкарыстоўваць любыя тэхнічныя сродкі, які будуць абмяжоўваць доступ да яго кантэнта. Варта адзначыць, што кантэнт, пазычаны <Аўтарам> з іншых рэсурсаў, распаўсюджваецца па правілах гэтых рэсурсаў і агаворваецца асобна.

**Што яшчэ патрабуе <Аўтар>?**

У дадатак да вышэй апісаных правілаў, <Аўтар> сайта падтрабуе ў дачыненні да сваіх фотаздымкаў ставіць сваё імя пад тэкстам артыкула, або пад назвай тэкста артыкула, або пад фота непасрэдна, пазначаючы сваё <Імя Аўтара>, якое з'яўляецца прамой спасылкай на твор. Калі фота трапляе ў галерэю, пазнака аўтарства павінна быць непасрэдна пад фота.